**НЕ дэкрэту аб «дармаедзтве»**

Дэкрэт прэзидэнта №3 аб «дармаедзтве» з'яўляецца антынародным па сваёй сутнасьці. Гэты чарговы для беларусаў рабаўніцкі пабор выглядае, як апошняя спроба ўраду залезьці ў кішэні да людзей.

**Эканамічнае і сацыяльнае фіяска** да якога прывяла постсаўковая сістэма кіраваньня ўсімі сьферамі жыцьця ў краіне, пазбавіла тысячы людзей годнай працы. Моладзь, як ніколі, накіравана на тое, каб шукаць шляхі з'ехаць з Беларусі ў пошуках будучыні, якую тут не бачыць.

**Культурнае жыцьцё таксама знаходзіцца ў моцным заняпадзе**. Навукоўцы і настаўнікі, студэнцтва і супрацоўнікі культуры – аднымі зь першых адчулі на сябе ціск. Скарачэнні, памяньшэнне заробкаў, адсутнасьць вакансій для новых спецыялістаў.

**За апошні год пацярпелі і працоўныя** – масавыя скарачэньні на прадпрыемствах, перавод на чатырохдзённы і нават трохдзённы графік працы.

**Падаткі – аддзеленая старонка жыцьця беларусаў**. Пачынаючы ад дадатковай аплаты пасылак з-за мяжы і да апошняга пабора з тых, хто хутчэй за ўсё і згубіў працу, дзякуючы неадэкватным захадам дыктатара і яго ўраду.

Мы, актывісты лібертарнага руху, заклікаем вас не плаціць гэты падатак, які пойдзе на чарговыя рэзідэнцыі «легітымнага» прэзідэнта (іх 17 штук). Таксама ня варта ніякім чынам супрацоўнічаць з падатковай службай і любымі іньшымі прадстаўнікамі рэжыму.

## Што канкрэтна вы можаце зрабіць, каб абараніць сябе і свае сродкі ад гэтых злачынцаў ад улады?

- **Вы маеце права непадпарадкоўвацца** законам, дэкрэтам і загадам, якія пагражаюць вашаму матэрыяльнаму становішчу, здароўю, ці такім жа чынам закранаюць вашых родных і блізкіх.

- **Вы можаце самаарганізоўвацца** на месцах каб праз інфармаваньне грамадскасці і ўзаемападтрымку супраціўляцца захадам дзяржавы накінуць на вас яшчэ адно падатковае ярмо.

- **Вы можаце праводзіць стачкі, пікеты, забастоўкі**, спрабаваць наладзіць кантакты з актывістамі, якія маюць пэўны досьвіт у правядзеньні такіх мерапрыемстваў.

**САПРАЎДНЫЯ ДАРМАЕДЫ – ЧЫНОЎНІКІ І ЎРАД!**